View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE

сопряженными научной истине, а аксиологическая компонента становится неотъемлемой составляющей научного исследования. Актуализируются проблемы этики науки и социальной ответственности ученого.

В свою очередь, глобализация в современной культуре проблемы здоровья и успехи биомедицинских исследований выводят медицину и фармацию на широкий круг новых проблем, имеющих ярко выраженные экологическую, экономическую, политическую, правовую и, наконец, духовную, нравственно-философскую и социально-психологическую составляющие.

Именно осознание триединства Истины, Добра и Красоты в культуре, взаимообусловленности естественнонаучной и гуманитарной культуры, принципа «благоговения перед жизнью»; взаимосвязи биосферы, ноосферы и этосферы в эволюции Вселенной; актуализация аксиологической составляющей в развитии постнеклассического типа научной рациональности и появление этики науки; глобализация проблемы здоровья и успехи биомедицинских исследований подготовили духовную почву для становления биоэтики как нового типа мышления и синтетической, междисциплинарной отрасли научного знания.

Слово «биоэтика» появилось сравнительно недавно, однако уже прочно вошло в наш словарный запас. Первым отчеканил этот термин и ввел в употребление известный онколог *Ван Ренсселер Поттер (Potter)* в 1971 году в книге «Биоэтика: мост в будущее». Введя данное понятие, он подчеркивал, что биоэтика должна стать «новой дисциплиной, соединяющей в себе биологические знания и познание системы человеческих ценностей». «Я выбрал, - писал он, - корень bio для символизации биологического знания, науки о живых системах, и Ethics для символизации познания системы человеческих ценностей» [2]. По словам Поттера, образовавшаяся пропасть между этическими ценностями человеческой культуры и биологическими основами его существования, лежащими в основе научно-технического прогресса, стали угрожать человечеству и самому существованию жизни на Земле. По его мнению, единственное, что может спасти нас от неизбежной катастрофы, это создание «моста» между двумя культурами – научной и нравственно-гуманитарной. Определение биоэтики как науки выживания приобретает широкий, философско-мировоззренческий смысл.

В то же время, осознание вмешательства человека во внешнюю природу, биосферу после открытий в сфере генетики человека, появление генной инженерии и успехов трансплантологии, дополнилось осознанием вмешательства человека в свою собственную биологию, во внутреннюю природу, что может угрожать здоровью человека. Это позволило *У.Т. Райху* в «Энциклопедии по биоэтике» (1978 г.) определить биоэтику как «систематическое исследование человеческого поведения в рамках наук о жизни и здоровье, проводимое в свете нравственных ценностей и принципов». В те же 80-е годы XX в. биоэтика получила новый научный импульс в работах знаменитого акушера голландского происхождения *Андре Хеллегерса*, который указал на междисциплинарный характер биоэтики: биоэтика для него это майевтика, т.е. наука способная обрести смысл лишь в процессе диалога ее с медициной, философией и этикой. Он сузил предмет биоэтики до этических аспектов, не рассматриваемых специально в клинической практике медицины. Именно его концепция биоэтики стала превалирующей: биоэтика начала рассматриваться большинством ученых как особая дисциплина, способная синтезировать биомедицинские и этические познания [1, 3].

Таким образом, становление биоэтики как науки обусловлено необходимостью выработки этических ориентиров человеческой деятельности, основанных на ценности Живого, Человека, его жизни и здоровья. Предметом биоэтики выступает нравственное отношение общества и человека к самому Человеку, его жизни и здоровью, иному Живому. Биоэтика – это практическая философия человеческой жизнедеятельности. Как интегративная дисциплина она выходит за корпоративно-профессиональные рамки и предполагает широкое общественное обсуждение проблем, связанных с развитием биомедицинской и фармацевтической науки и практики.

**Литература:**

1. Основы биоэтики : учеб. пособие / Я.С. Яскевич [и др.] ; под ред. Я.С. Яскевич, С.Д. Денисова. – Минск : Выш. шк., 2009. – 351 с.
2. Поттер, В.Р. Биоэтика. Мост в будущее / В.Р. Поттер. – Киев, 2002. – С.7.
3. Хрусталев, Ю.М. Биоэтика. Философия сохранения жизни и сбережения здоровья : учебник / Ю.М. Хрусталев. – М. : ГЭОТ АРМедиа, 2013. – 400 с.

## МЕСЦА ЮНРРА Ў СПРАВЕ САЦЫЯЛЬНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ІНВАЛІДАЎ І ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

***Марцынкевіч І.А.***
***УО «Витебский государственный медицинский университет»***

Ва ўмовах пасляваеннага вострага дэфіцыту тавараў першай неабходнасці ўрад СССР быў вымушаны шукаць дадатковыя эканамічныя меры, з дапамогай якіх можна было б вырашыць праблему слабой забяспечанасці прадуктамі харчавання і мінімальна задаволіць надзённыя патрэбы насельніцтва. Адным са шляхоў папаўнення ўнутранага рынку БССР сталі пастаўкі, наладжаныя па лініі ЮНРРА [1, с. 172].

Адміністрацыя дапамогі і аднаўлення Аб’яднаных Нацый (абрэвіятура ад пачатковых літар англійскай назвы ЮНРРА) была створана ў лістападзе 1943 г. дзяржавамі антыфашысцкай кааліцыі, у тым ліку і СССР, як спецыялізаваная ўстанова ААН для аказання дапамогі ў аднаўленні эканомікі краінам, найбольш пацярпелым у гады Другой сусветнай вайны [2, с. 59]. Беларусь як адна з дзяржаў-заснавальніц ААН атрымала дапамогу ў выглядзе неабходных прадуктаў, медыкаментаў, адзення, а таксама сельскагаспадарчых прыладаў і прамысловага абсталявання, што было асабліва каштоўна для аднаўлення разбуранай вайной эканомікі рэспублікі і аказання сацыяльнай дапамогі дэмабілізаваным.

Місія ЮНРРА на Беларусі дзейнічала з красавіка 1946 г. да сакавіка 1947. Згодна з прынятым статутам, ЮНРРА павінна была ажыццяўляць сваю дзейнасць на вызваленай тэрыторыі пасля кансультацыі і ўзгаднення з урадам. Быў вызначаны парадак выдачы дапамогі і яе размеркавання [3, с. 214-215]. У першую чаргу выдаваліся прадукты харчавання, паліва, вопратка і медыкаменты, затым размяркоўвалася насенне, ўгнаенне, сыравіна, рыбалоўнае абсталяванне, машыны і запчасткі. Заключным этапам паставак з’яўлялася аказанне дапамогі ў аднаўленні грамадскіх устаноў [4, с. 21-22].

Дзейнасць ЮНРРА ў сельскай гаспадарцы абмяжоўвалася мерапрыемствамі, галоўным чынам у першы год пасля вызвалення ад акупацыі. Увага органаў была скіравана на збор ураджаю і захаванне пагалоўя жывёлы. У прамысловасці асноўная дапамога аказвалася ў аднаўленні вытворчасці тавараў шырокага спажывання, прадуктаў харчавання, вопраткі і медыкаментаў. ЮНРРА таксама забяспечвала будаўнічымі матэрыяламі для аднаўлення жылфонду, у першую чаргу бальніц, школ, жылля для тых, хто застаўся без даху. [Там жа, с.22-23].

СНК БССР былі створаны органы па пастаўках ЮНРРА для арганізацыі прыёму, размеркавання, уліку тавараў, што выдзяляліся з фондаў, а таксама для кантролю за своечасовым паступленнем і мэтанакіраваным выкарыстаннем сродкаў, атрыманых ад рэалізацыі тавараў. [5, арк. 163]. З-за цэнтралізаванага характару савецкай эканомікі і дэфіцыту тавараў усё харчаванне, якое паступала ў рэспубліку па лініі ЮНРРА, размяркоўвалася толькі Саветам Міністраў БССР. Сярод прыярытэтных груп насельніцтва, якім выдавалася гуманітарная дапамога, былі дэмабілізаваныя і інваліды Вялікай Айчыннай вайны [6, с. 35-36].

Галоўны ўпаўнаважаны СНК БССР па атрыманні і рэалізацыі тавараў ЮНРРА В. Выхадцаў прапаноўваў бясплатна раздаць 70 000 пайкоў інвалідам Вялікай Айчыннай вайны, сем’ям загінуўшых ваеннаслужачых і партызан, а таксама рэпатрыяваным грамадзянам. Выдачу гэтых пайкоў ён раіў праводзіць праз адпаведныя аддзелы выканкамаў (гарсабесы, гаррайсабесы, дзяржсацзабеспячэнне). На яго думку, кожны паёк павінен быў складацца з 0,5 кг мясных кансерваў, 0,5 кг сыру; 0,4 – 0,8 кг малака, 2 – 3 кг бабоў [7, арк. 23.]

Так, згодна з просьбай Савета Міністраў БССР ад 18 мая 1946 г. “Аб аказанні харчовай дапамогі інвалідам Айчыннай вайны, сем’ям загінуўшых воінаў і асабліва сельскаму насельніцтву, якое мае вострую патрэбу”, саюзным урадам было адпушчана 1600 тон армейскіх рацыёнаў з фондаў ЮНРРА. Прадукты адпускаліся без харчовых картак і размяркоўваліся па абласцях. На старшынь выканкамаў Бабруйскага, Віцебскага, Гомельскага, Мінскага, Магілёўскага, Мазырскага і Полацкага абласных Саветаў дэпутатаў ускладалася адказнасць за размеркаванне выдадзенага харчу строга па ўказаным кантынгенце па аднаразовых талонах [8, арк. 193.]. Праз месяц, 29 чэрвеня гэтага ж года, выйшла яшчэ адна пастанова СМ БССР “Аб аказанні харчовай дапамогі насельніцтву, якое мае вострую патрэбу”. З паставак ЮНРРА выканкамам аблсаветаў было выдзелена 3 000 тон бабовых. Размеркаванне і продаж прадукта ажыццяўлялі ў адпаведнасці з зацверджанымі мясцовымі Саветамі спісамі, першымі ў якіх былі сем’і загінуўшых воінаў і івалідаў Вялікай Айчыннай вайны [9, арк. 48. ].

12 ліпеня 1946 г. з фондаў ЮНРРА па абласцях і раёнах было выдаткавана і размеркавана 1 400 тон армейскіх рацыёнаў. Першачаргова прадукты атрымлівалі сем’і загінуўшых воінаў Чырвонай Арміі, партызаны, сем’і інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, а 10 % з гэтай дапамогі было накіравана на забеспячэнне будаўнічых брыгад, якія ўзводзілі дамы калгаснікам, а таксама тым, хто на той момант жыў у зямлянках [Там жа, арк. 33.].

Часткова юнраўскія прадукты ў выглядзе пайкоў праз аддзелы выканкамаў размяркоўваліся інвалідам Вялікай Айчыннай вайны. У адзін набор уваходзілі наступныя найменні: мясныя прадукты – 0,5 - 1 кг, сыр – 0,5 кг; малако – 0,4 - 0,8 кг. Аднак колькасць бясплатных пайкоў была вельмі нязначнай і вагалася ў межах 5 – 10 % ад агульнай колькасці харчовых тавараў.

Улічваючы неабходнасць кантролю за размеркаваннем фондаў, што паступалі па лініі ЮНРРА, у першыя пасляваенныя гады былі створаны спецыяльныя камісіі. У Полацкую, Палескую, Магілёўскую, Бабруйскую, Гомельскую, Віцебскую вобласці былі накіраваны рэвізоры, якія кантралявалі выдачу харчовых тавараў строга па спісах мясцовых Саветаў [Там жа, арк. 33].

Акрамя прадуктаў харчавання, з тавараў, што паступалі па лініі Адміністрацыі дапамогі і аднаўлення Аб’яднаных Нацый для дэмабілізаваных з Чырвонай Арміі і інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, праз аблвыканкамы выдавалася вопратка і іншыя прамысловыя тавары. Да прыкладу, 3 лістапада 1946 г. было выдзелена 0,2 тоны вопраткі і падарункаў, частка з якіх прызначалася былым франтавікам [7, арк. 23]. Супрацоўнікам кіраўніцтва пастаўкамі ЮНРРА пры Савеце Міністраў БССР, большасць з якіх з’яўляліся дэмабілізаванымі з Чырвонай Арміі, былі выдадзены ордэры на прамысловыя тавары, вопратку, абутак і інш. [Там жа, арк. 73]. Па такіх фактах прымаліся адпаведныя меры.

Нягледзячы на пільны кантроль з боку дзяржавы, мясцовых органаў улады за таварамі па лініі ЮНРРА, фактаў раскрадання часткі фондаў пазбегнуць так і не ўдалося. Так, у адной з дакладных у аддзел па барацьбе з

крадзяжамі сацыялістычнай уласнасці на імя начальніка палкоўніка Арлова адзначалася, што 14 лютага 1947 г. з порта Адэсы быў адасланы маршрут для БССР з прадуктамі і тэхнікай. За іх захаванасць адказвала група праваднікоў на чале з грамадзянінам Васкабойнікам. У порце ён прыняў усё па акце і спецыфікацыі. Аднак на прыёмцы груза ў Мінску высветлілася, што не хапала 2 500 штук цыгарэт і 228 кг рознага харчавання (50 кг цукру, 1 банкі яічнага парашку, 1/3 скрыні макаронаў, 3 каробкі пшанічнай кашы і інш.) [10, арк. 63].

У цэлым, пастаўкі па лініі Адміністрацыі дапамогі і аднаўлення Аб'яднаных Нацый не маглі поўнасцю задаволіць неабходныя патрэбы інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, тым не менш яны адыгралі значную ролю ў сацыяльным забеспячэнні і задавальненні першачарговых патрэб былых франтавікоў. Неабходны кантроль за правільным размеркаваннем фондаў, асабліва што паступалі па лініі ЮНРРА, ажыццяўлялі спецыяльныя камісіі. Яны кантралявалі працэс прыёму, уліку, выдачы тавараў, што спрыяла забеспячэнню неабходнымі таварамі сем'яў і асобных грамадзян, найбольш пацярпелых ад фашысцкай акупацыі. Нягледзячы на абмежаваны, недастатковы аб'ём, выдзеленая з гэтых фондаў дапамога палягчала пераадоленне пасляваеннай разрухі, садзейнічала вырашэнню харчовай праблемы ў гарадах і вёсках БССР.

**Літаратура:**


1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 6. Кн. 2: Усвея – Яшын; Дадатак / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мн. : БелЭн, 2003. – 616 с.
2. Снапкоўскі, У. Е. Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі (1944−1953 гг.) / У. Е. Снапкоўскі. – Мінск : Беларус. навука, 1997. − 208 с.
3. Снапкоўскі, У. Е. Аб дапамозе ЮНРРА Беларусі (1945–1947 гг.) / У. Е. Снапкоўскі // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы) : Усебел. канф. гіст., г. Мінск, 3–5 лютага 1993 г. : у 2 ч. Ч. 1. Гісторыя Беларусі. – Мінск : Універсітэцкае, 1994. – С. 214–219.
4. Воскресенский, А. Что такое ЮНРРА / А. Воскресенский. – Магадан : Сов. Колыма, 1944. – 24 с.
5. НАРБ. – Фонд 4п. – Воп. 29. – Спр. 154.
6. Вялікая, В. А. Ажыццяўленне харчовай праграмы ЮНРРА ў Беларусі (1945–1947 гг.) / В. А. Вялікая // Весці БДПУ. Серыя 2. Гісторыя, філасофія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, культуралогія. – 2007. – № 3. – С. 35–37.
7. НАРБ. – Фонд 462. – Воп. 4. – Спр 11.
8. НАРБ. – Фонд 4п. – Воп. 29. – Спр. 225.
9. НАРБ. – Фонд 462. – Воп. 3. – Спр 70.
10. НАРБ. – Фонд 462. – Воп. 4. – Спр 2.


## ЭСТЕТИЧЕСКОЕ ВОСПИТАНИЕ МОЛОДЕЖИ: ОПЫТ СОВЕТСКОГО ОБЩЕСТВА 1920-1930-Х ГОДОВ


***Мусина Н.Е.***

***УО «Витебский государственный медицинский университет»***


Эстетическое воспитание – одно из важнейших направлений процесса воспитания подрастающих поколений и необходимое условие для полноценного развития личности. Оно направлено на формирование ценностных ориентаций личности, развитие ее творческого потенциала, проявляющегося в его профессиональной деятельности, быту, в отношении к себе, природе, во взаимоотношениях с другими людьми. Главная цель эстетического воспитания – научить человека видеть, понимать и ценить прекрасное. При этом могут быть использованы различные средства: искусство, архитектура, музыка, кино, театр, литература, мода, природа и т.д.

В современных обществах, где сосуществует множество субкультур, информационных потоков, многообразие культурных форм и вкусовых предпочтений различных социальных групп, молодому человеку сложно ориентироваться и определиться с истинными и мнимыми идеалами. Те социально-экономические, политические и культурные процессы, которые происходят в настоящее время в обществах во всем мире, безусловно, оказывают влияние на процесс воспитания, требуют переосмысления его целей, содержания, а также поиска новых идей, форм воздействия на молодежь. Выработка новых подходов, адекватных потребностям, проблемам современного общества, предполагает не только изучение и обобщение современных систем образовательно-воспитательного процесса, но и знание предшествующего опыта.

1920-1930-е годы в жизни советского общества – это период революционных преобразований, связанные со строительством социализма. Одной из важнейших стала задача формирования *нового человека* с соответствующими физическими и духовными качествами, моральными нормами и мировоззренческими установками. Воспитание такого человека включало различные направления: антирелигиозное, военно-патриотическое, физическое, нравственное, эстетическое в том числе. Все эти направления были тесно связаны между собой и подчинены идейно-политическим установкам и принципам коммунистической партии. Формировалась, таким образом, новая система ценностей и система воспитания на ее основе. Главным объектом воздействия стала молодежь. В этом процессе должны были быть задействованы школа, техникум, вузы, клубы,